пралцы або ткацкім станку, каб яны выраслі працавітымі людзьмі. Да канца першага года жыцця дзяцей прывучалі самастойна мыцца, прычэсвацца, трымаць лыжку ў руцэ, карыстацца ёю.

Такім чынам, адным з найважнейшых крыніц сучаснай тэорыі і практыкі выхавання дзяцей ранняга ўзросту з'яўляецца беларуская народная педагогіка як сукупнасць педагагічных звестак пра досвед выхавання, якія захаваліся ў памяці народа. У беларускай народнай педагогіцы прадстаўлены і аксіялагічныя аспекты маральнага выхавання дзяцей. Беларуская народная мудрасць дапамагае настаўніку лепш зразумець змест маральнага выхавання, яго прынцыпы і метады, у аснове якіх ляжаць гуманістычныя ідэалы: вера ў магчымасць маральнага ўдасканалення чалавека, патрабаванне павагі да чалавека і стварэнне ўмоў, неабходных для развіцця асобы. Беларускі народ лічыць чалавечнасць галоўнай маральнай якасцю асобы, разглядае яе шырока, уключае ў паняцце чалавечнасці іншыя якасці, да прыкладу, паважлівыя адносіны да людзей. Для выпрацоўкі ў падрастаючага пакалення правільнай маральна-каштоўнаснай арыентацыі і выхавання гуманізму народ карыстаецца разнастайнымі сродкамі і метадамі [5]. Найбольш дзейснае і эфектыўнае – асуджэнне бесчалавечнасці: «Чалавечына! Адна душа ў боце, другая ў жывоце, а трэцця па свеце ходзіць да людзей зводзіць». Не менш яскрава праяўляюцца каштоўнасныя арыентацыі народнай педагогікі ў справе патрыятычнага выхавання. У яго аснове – выхаванне любові да Радзімы, да роднай зямлі і дому, да прыроды, да маці. Неад'емнай часткай і дзейсным сродкам патрыятычнага выхавання з'яўляюцца прыказкі і прымаўкі, легенды і паданні, казкі і песні. Народны вопыт патрыятычнага выхавання можа быць карысным настаўніку і ў педагагічнай прафесійнай арыентацыі. Такім чынам, беларуская народная педагогіка ўключае ў сябе сістэму каштоўнасных паняццяў, уяўленняў, поглядаў, і менавіта яна дапамагае ўзняцца да вяршынь агульначалавечых маральна-духоўных каштоўнасцей. Толькі праз этнапедагогіку можна пракласці шлях да агульнаграмадскай педагагічнай культуры [5].

Духоўныя каштоўнасці і ідэалы беларускага народа, лепшыя узоры нацыянальнай культуры – аснова адаптацыйных стратэгій сучаснай сям'і. Неабходна праводзіць мэтанакіраваную працу па ўмацаванні духоўных асноў грамадскага развіцця, што ў перспектыве дасць магчымасць для фарміравання новых мадэляў і стандартаў у сямейных і сямейна-шлюбных стасунках. У іх аснове будуць зацверджаны нормы не спажывецкіх адносін да чалавека, асяроддзя, соцыўму, а нормы высокіх маральных устояў, самаўзнаўлення і самаарганізацыі.

**Спіс літаратуры:**


1. Ракава, Л.В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. / Л.В. Ракава ; НАН Беларусі, ІМЭФ. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 309 с.
2. Беларусы / НАН Беларусі, ІМЭФ. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 10 : Славянскія этнакультурныя традыцыі / І.У. Чаквін, А.У. Гурко, Т.І. Кухаронак. – 2007. – 513 с.
3. Беларусы / НАН Беларусі, ІМЭФ. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 5 : Сям'я / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 2001. – 374 с.
4. Беларускі фальклор : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для філал. спец. вышэйш. навуч. устаноў / склад. : К.П. Кабашнікаў і інш. – Мінск : Вышэйш. шк., 1996. – 856 с.
5. Мид, М. Культура и мир детства : избр. произв. / М. Мид ; пер. с англ. и ком. Ю.А. Асеева; сост., авт. послесл., отв. ред. И.С. Кон ; АН СССР, Ин-т этнографии им. Н.Н. Миклухо-Маклая. – М. : Наука, 1988. – 429 с.


***Фёдар Рацык***

## ЖЫВЕ Ў МОТАЛІ ТАЦІРКА…

Кожны чалавек, які жыве ў гэтым свеце, пакідае свой след. Хтосьці пакідае след матэрыяльны, а нехта духоўны. Матэрыяльнае праз некаторы час можа ператварыцца ў попел ці труху, альбо, калі яго дбайна не захоўваць, знікнуць. Духоўнае, нематэрыяльнае, што захоўваецца ў чалавечай памяці, павінна праз некаторы час праходзіць працэс паўтарэння і узнаўлення. Абрады, звычаі, парадкі доўгі час захоўваліся ў людской памяці і перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Гэта прымянялася на ўласным вопыце, узаемадзеянні з асяродкам пражывання, выхаванні калектыўнай асобы і пэўнай мадэлі паводзін, якая склалася ў гістарычным развіцці грамадства.

Самабытнасць культуры Моталя, што ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці (мал. 1), дазволіла захаваць абраднасць [1] і традыцыйнасць. Але гэтага нельга б было зрабіць без сапраўдных аматараў песні. Адна з цікавых фармаў перажадчы традыцый – супрацоўніцтва з жыхарамі невялікіх вёсак, падчас якога яны абуджаюцца, маладзеюць душой, дзеляцца скарбамі сваёй памяці.Пра развіццё і станаўленне асобы спявачкі Любові Іванаўны Каткавец (мал. 2) як носьбіта традыцыйнай культуры будзе ісці гаворка. У яе памяці захаваны ўвесь фальклорна-этнаграфічны рэпертуар. Гэта песні каляндарнага і сямейна-побытавага цыклаў, лірычныя, дзіцячыя, сірочыя песні, замовы і апісанні абрадаў і звычаяў, легенды, прыкметы, павер'і.

Фарміраванню голасу і манеры спеву, па меркаванні самой спявачкі, яна абавязана ў першую чаргу прыродзе і бацькам: «*У мэнэ воно мой прыроднэ гэтэ спыванне.І cчытаю, шо гэто даецца от прыроды. Оге бы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*музыку. Чоловік чуе, як птушкі спывають, як прырода будыцца, вын грае на гармоні – вын гэтэ чуе. Я гэтак не – я оно спываты ўмію. Гэто оно наследство таке пэрэдаецца.Мый батько надто хорошэ спываў. Батько мый спываў, шо і тэпэр ўспомынають тышкоўцы, которы помэтають его. Вын буў шэ кавалером, росказвалы, дід мый Андрый, да на бабу Еўгеню, казаў: - Еўгеня, іды сюда, іды послухай, як наш красавец поет на Выгоны (урочышча в. Тышкавічы). І маты моя спывала хорошэ тожэ. Тітка тожэ ўміла. І от я од матэры. Алэ, як бы нэ було слуху, то і нэ научыласа б. Воно само чоловіковы даецца. Як будэм дома сэдіты, чы дэ ў пыст, чы дэ ге вэчуром з матэрэю, то маты кудэлю прадэ, а я вышываю і мы спываем пісні. І сырыточку, і Лазора. Маты спывае пэршым голосом, а я пудводю, алэ тыхенько, а маты ўжэ мні туруе. Ў комнаты будэм сэдіты ўдвох будэм спываты.А потом прышло ў голову такее. Ну гэто мэнэ і маты так тожэ учыла. Трэба спываты так – як пісня боевая да задорна, то ты ге і спывай, як пісня жалослыва то трэба і голос робыты такій. От е така пісня про жураўку: "...Дэсь у мэнэ мамка е, вона мэнэ жадае, вона мэнэ жадае, як вэчэрать сядае"... Маты еі садыцца вэчэраты і ложэчкі счытае і дэсь у світы дочка е, і тут "одбыласа од роду, як той камэнь у воду". Як заспываеш "у воду", то сам бы той камэнь. "Упаў камэнь да й лэжыть, на чужыні трудно жыть". І прышло ў голову таке шо пісні трэба ге спываты, як оны кажуцца, то тэе трэба спываты. Як бы нэ чула пісен, шо ніхто спывае, то можэ і нэ ўміла б. А раз у хаты песні ідуть, то і ўсе».*



*Малюнак 1* – Калектыў "Мотальскія суседзі", Любоў Іванаўна Каткавец – другая злева, 1989.



*Малюнак 2* – Л.І.Каткавец, 2012.

Вялікую ролю ў станаўленні майстэрства калектыўнага выканання песняў адыграла яе сястра: «*У мэнэ сэстра була старша з 1932 року, то оны збэруцца з дыўкамы, о тута ў Скакуна, дэ ганкі, і мэнэ з собою брала, і я там мэж імы, і оны мэнэ застаўляють пудводь. І я пудводю. І прышло гэтэ до мэнэ і прышло і прышло...Сэстра старша, ў клубы, як шо спывалы на сцэны, заўшэ запевалэю була. Поіхалы мы на Сібір у заробкі, то она робыла ў больніцы і возглавыла там хор*».Менавіта гуртавыя песні раскрылі патэнцыял падводчыка, а месцаміі харызматычнага завадатара: «*І зноў була прывязанность у мэнэ до того, шо дэ нэ йшла, то усюдэю спывала. Пыду на вэсілле дэгоды, я ныколы нэ садыласа о там за столом, коб мні потом вылазыты трэба було. Колы музыка заграла, чы я выпыла там тых грам сорок, чы нэ выпыла, мні пыты нэ трэба було – я ўжэ тама спываю і нэ ўтыхаю. Просто гэтак мні хотілос спываты, танцоваты. А голос буў то мэнэ шэ шукалы, коб заходыла.Ніколы Болько, вын торговаў, як балы спраўлялы, то вын на Турублі з намы спываў. У его була любіма пісня "Над озером чаечка". То вын, да Тодосыковы хлопцы і Лапчуковы, тыі шо на Коржыўцы, такі любітелі булы поспываты. То я надліпш із ім спывала. Як заспываемо, вын заводыў, а я пудхватьваю, ныхто нэ трэба буў, ўся хата аж гудэ. Помэтаю, як хлопцы ніколы запевалы Букатюкабо Зайчык Степа. Хоть і хлопцы молодыі булы, крыклывы, алэ тожэ ўмілы хорошэ вывэсты.Песні прыходять з годамы. Мый Іван (сын) коб спываў, да спываў ге бы ніколы, да стараўса спываты, да научытыс, то вын ге, станэ спываты, як оно нэ туда повэдэ, то вын зразу чуе.А от Таня (дачка) нэ ўміе"*. Пры выхаванніісваіх дзяцей Любоў Іванаўна адчула праблему ў прыцягненні іх да культуры. Галоўную праблему яна бачыць ў бессістэмным працэсе выяўлення, прыцягнення і навучання дзяцей традыцыйным спевам:«*Кілька було школьнікей, шо спывалы ў хоры, нэ ге бы ў іх зарэ, шокоторый заспывае, то вын га-га-га да гі-гі-гі*».Альтэрнатыву школьнаму навучанню музыцы дае царкоўны хор,праз удзел у якім яе ўнучка прыйшла да традыцыйных спеваў: «*А ўжэ ўнука, ў школу ходыла, то ходыла ў цэркву на крылас, іх штыры діўчынкі було, гэта ўжэ сама. Я еі ніколы спывала Татірку і вона од мэнэ почула, і ля ій так гэты слова понаравылыса, шо еі так у душу гэты слова залізлы. І вона*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*научылаcа і сама спывала еі. Пытала, як розрэшытэ бабыну пісню поспываты, то поспываю. Казала увэсь зал аплодіровалы, а которы пожылыі, то шэ і плакалы. Вона постная*».

Добры спосаб прыцягнуць увагу дзяцейда традыцыйнай культуры, па меркаванні Любові Іванаўны, – арганізацыя вячорак, альбо,як раней іх называлі, зборняў:«*За мэю памяттю зборні робылы як було тэпло. Робылы коля Лыпы, коля Млына, на Луцы, на Калыльскій. Як нэділя то і ўдэнь робылы. На гулыцы коля дэкого, чы коля крыжа, дэ лаўка е, босяком танцовалы. А ў зыму робылы ў хатах. Ў хаты, до кого ходять тыждэнь, або зборня, шо наймалы хату, хазяіновы платять, і ўсю зыму ўжэ збыраюцца туда. А по тыжднёвы, то гэто до мэнэ тыждэнь, до другеі тыждэнь. А хлопцы з гармонею ходылы, мныга ходыло, да і танцовалы. А танцы понаўчвалса од кого, од батькей і от старшых. Маты нэ танцовала, то матэрына сэстра, моя старша сэстра. Старынны танцы танцовалы. А маты росказвала, шо ніколы, як робылы Кануны на Коляды. Ходылы ў колядныкі, назбыралы, да робылы бал. Ніколы ў хату нэ вэлы - хаты ж малэнькі булы, а ў хліў, чы клуню. Ў клуні тык. То там на току робылы. Прыбрано там усё і чысто. Лыхтара запалылы і танцы там. Гэто, як збыралыса до матэры, то ўсі росказвалы… Пообуваюць чэрэвычкі на каблуках, ногі аж кіплять, алэ там танцы. Ўчылыс однэ ў одного. Ніколы дыўкі булы старшы за мэнэ і оны на зборню збыралыса коля Бандзэра. Як прыдэ гармоніст Рыгуш там ўсэ граў. Вын сэдыть грае, як вышлы, сталы кольцом, кажда одна запевае “Сербіянку”, однэ-дві словы сказала ўсі гуртом доспіўвають і ўкруга ідуть. Тэпэр усэ пэрэкрутять, шо аж страшно дывытыс… Костюмы хорошы, алэ нэ тыі. У мэнэ свый естя*». Каб вячоркі праходзілі як трэба, то патрэбны гарманіст: «*Дядько мый на гармоні граў і спываў. У нас его гармоня естя. І шэ одна естя. То тая, як булы вэсілля, да, як гармоніста трэба було наймаmы, то прыходылы хлопцы просылы і бралы. То і ў Осуныцы (суседняя веска) і за Осуныцэю дэ она оно нэ була. Да рэмонт трэба гармоні*».

У свой час Любоў Іванаўна была спявачкай розных калектываў самадзейнасці:«*Я робыла ў бібліотецы ўборшчыцэю і ў кафэ. Мэнэ сталы просыты спываты. А ў тэе врэмя ўсі брыгады застаўлялы выступаты на сцэны. Бы сорэўновалыса. Я і од кафэ і од бібліотекі спывала. Од кафэ до Янова іздыла шэ нідэ і грамота естя*».Потым на базе гасцёўні мясцовага калгаса “40 гадоў Кастрычніка” быў створаны фальклорна-этнаграфічны тэатр “Мотальскія суседзі”: «*Ліда Войцахова, Ліда Вылыўка оны хорошэ спывалы да і сталы зваты до сэбэ. Ліда Тарасюкова і Куртыха, то нам ныхто нэ трэба буў. Воны турують, а я пудводю. Раз сорэўновалыса, ўжэ ў нас хор, да Анетько, сцэнкі ставылы“Чай з бобынэю”, “Сам пушоў”*». З удзелам гэтага калектыва былі створаны стужкі па аўдыёвізуальнай антрапалогіі “Палескія вяселлі”, “Пераблытанка”, “Мотальскія байкі” і інш. Вялікую зацікаўленасць да старэйшых ўдзельнкаў гэтага калектыва праяўлялі даследчыкі з Беларусі, Украіны (Студыя “Атлантык”, Етнічна музика України), Польшчы: «*Прыізжалы з Польшы (*экспедыцыя Дарафея Фіенніка ў 2011 годзе, стваральніка музея Малой Айчыны ў Студзіводах каля Бельска-Падляшскага*). Прыйшла Шпіенка, я і наша Надя. Сталы спываты Лазора. Началы спываты. А ў мэнэ гэтакій голос, шо як туру мныга да ныизько то шэ можу пудвэсты, а як ужэ вышшэй – не. Стала я пудводыты – нэ можу. Нэхай Надя. А от наша Надя вона ўміе спываты і ўсэ, но вона голосом нэ ўміе завладіты. Кажу - там трэба бы поплакаты, там бы громчэй. На самым деле ў мэнэ ўжэ нэмае голосу, а ў еі шэ е. Стала Надя. Мні ге здаецца шо вона бы звончэй да ліпш. А вын (Дарафей Фіеннік) сказаў не*».

Вынікам гэтай экспедыцыі стала публікацыя кружэлкі "Песні з-пуд Янова". Украінскімі даследчыкамі яшчэ ў 1990-я гады былі выпушчаны два дыскі "Веночок рутьявенькій" [2] і "В гетой хаті" [3]. Менавіта такія экспедыцыі і далейшая публікацыя запісаў дапамагае носьбітам абуджацца, маладзець душой, дзяліцца скарбамі сваёй памяці, дагэтуль недаацэненымі.На гэтых дысках захаваўся звонкі мілагучны голас…

Жыццёвы вопыт бабы Любы, светапогляд, узаемаадносіны з суседзямі і родзічамі – ўсё гэта з гадамі шліфавалася, але час бярэ сваё. Узроставыя хваробы не даюць ўжо спяваць так як трэба, ды і няма з кім. Старыя паміраюць, а маладзейшыя ўжо не ведаюць, ды і так атрымліваецца, не хочуць ведаць, што каля іх жывуць такія цудоўныя людзі. Дэмаграфічная сітуацыя на вёсцы вымывае з асяродку моладзь, якая павінна ўсё пераймаць.

**Спіс літаратуры:**


1. Вясельная каравайная традыцыя вёскі Моталь. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : http://livingheritage.by/nks/3353/ . – Дата доступу : 10.04.2015.
2. Альбом - Вєночок рутьвяненький. Традиційна музика Берестейщини (2004). [Электронны рэсурс] – http://www.vulyk.ua/Etnichna-myzyka-Ykrayiny%2FVjenochok-rytvyanenkyi_1. Дата доступу: 10.04.2015.
3. Альбом - "В гетой хаті".[Электронны рэсурс] – http://www.vulyk.ua/Etnichna-myzyka-Ykrayiny/V-hetoi-hati_1. Дата доступу: 10.04.2015.


***Валерия Лукьянцева***

## ТЕОРЕТИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ВЗАИМОВЛИЯНИЯ ИСКУССТВ

Современная система искусств, место, которое в ней занимают различные виды художественного творчества, рождение новых искусств, взаимоотношения между старыми и новыми искусствами выражают сложность и многогранность общественной жизни и эстетических потребностей современного человека. Систему искусств в наше время характеризуют особенности, которые хотя и существовали в прошлом, но наполнились иным содержанием.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ